УДК327(470+571)

**А. К. Шымак,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
дацэнт кафедры гісторыі Расіі БДУ
(Мінск, Беларусь)

# УСХОДНЯЯ ЕЎРОПА Ў АНТЫАСМАНСКАЙ ПАЛІТЫЦЫ ПАПЫ ПІЯ V

Ва ўмовах усё большай пагрозы для Еўропы з боку Асманскай імперыі, калі актыўна пачала распрацоўвацца ідэя антытурэцкай кааліцыі, Рымская курыя выступала з заклікамі спыніць ваенныя дзеянні паміж еўрапейскімі хрысціянскімі дзяржавамі. З мэтай прыцягнення дадатковых сіл да антытурэцкай барацьбы стратэгічнай лініяй Апостальскай Сталіцы стала падтрыманне міру сярод дзяржаў Усходняй Еўропы. У існуючых умовах паміж Вялікім княствам Маскоўскім, з аднаго боку, і Вялікім княствам Літоўскім і Каронай Польскай - з другога, ішла напружаная дыпламатычная барацьба за «заступніцтва» Рымскай курыі.

У 1566 г. на пасад св. Пятра быў абраны дамініканец Антоніо Гісліеры. Стаўшы папам, Пій V пачаў энергічна ператвараць у жыццё пастановы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Трыдэнцкага Сабору, змагаўся з сіманіяй і непатызмам (раздаваннем касцёльных пасадаў сваякам), звярнуў увагу на маральны стан духавенства, аднавіў структуры Рымскай курыі. Канфрантацыя з Асманскай імперыяй ставіла Рымскую курыю перад неабходнасцю шукаць кантактаў і з Масквой [4, s. 190]. Уцягваючы Расію ў антытурэцкія войны, імператар Максіміліян і папа Пій V імкнуліся аслабіць націск турак у Цэнтральнай Еўропе і адцягнуць Маскву ад барацьбы за Лівонію. Папа імкнуўся выкарыстоўваць гэтыя перамовы і для прапановы царкоўнай уніі. Тым не менш, у Рымскай курыі ўсведамлялі, што рэлігійнае пытанне заўсёды будзе няпростым для абмеркавання з маскоўскімі вялікімі князямі.

У 1567 г. інструкцыю для выканання місіі нунцыя ў Кракаве атрымаў Вінцэнта даль Портыка [1, p. 217; 2, s. 284]. Планы Курыі прыцягнуць Маскву да антыасманскай лігі падтрымала Венецыянская рэспубліка. Венецыянскі дож звярнуўся да Івана IV з просьбай падняць зброю супраць «няверных» і адправіў сваё пасольства праз нунцыя [3, p. 079]. Але Портыка адхіліў просьбу венецыянскага сената з-за боязі выклікаць незадаволенасць Жыгімонта II Аўгуста, які мог убачыць у гэтым ушчамленне сваіх інтарэсаў.

Акрамя таго, спадзявацца на дазвол на праезд з боку Жыгімонта II Аўгуста не дазваляў і той факт, што становішча Вялікага Княства Літоўскага напрыканцы 60-х гг. XVI ст. змянілася. Люблінская ўнія замацавала з’яўленне на міжнароднай арэне Рэчы Паспалітай.

Пасля заключэння 22 ліпеня 1570 г. трохгадовага перамір’я паміж Іванам IV і Жыгімонтам II Аўгустам венецыянскі ўрад аднавіў перад Портыка свае хадайніцтва. Папа таксама актывізаваў сваю дзейнасць і ў пасыланым Івану IV брэвэ пераконваў яго ўступіць у антыасманскую лігу [5, c. 218–220]. Рым быў упэўнены ў паспяховай дзейнасці нунцыя Портыка, засноўваючы свае перакананні на жаданні маскоўскага князя атрымаць каралеўскі тытул.

У кастрычніку 1570 г. Портыка, які ўжо знаходзіўся ў Польшчы, атрымаў ліст ад кардынала Рустыкучы. Апошні сумняваўся адносна мерапрыемства і прапанаваў, калі дамоўленасцяў з Масквой, на якія так разлічваў папа, не атрымаецца дасягнуць, то належыць адкласці ўбок усю справу, а грошы, прызначаныя на дарогу, можна скарыстаць на бягучыя патрэбы [7, c. 229].

Перашкодай, як і раней, заставаліся варожыя адносіны Рэчы Паспалітай і Масквы. Перамір’е, на якое Рымская курыя ўскладала вялікія надзеі, сябе не апраўдвала. У Рэчы Паспалітай любое збліжэнне Рыма з



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Масквой разглядалася як таемная пагроза сваім інтарэсам. Вялікі князь літоўскі і кароль польскі катэгарычна адмаўляў папскаму нунцыю ў дазволе для праезду.

У маі 1571 г. у Варшаву прыбылі маскоўскія паслы для канчатковага замацавання перамір'я. Нунцый Портыка разлічваў весці перамовы з імі. Аднак ён атрымаў адмову, апраўданую адсутнасцю спецыяльнага для таго дазволу. У Рыме было прынята рашэнне адправіць да Івана IV канфідэнцыйную асобу. У Маскву выехалі два агенты нунцыя Портыка. Але, на жаль, няма ніякіх звестак адносна вынікаў гэтай місіі, хаця відавочна, што на яе ўскладаліся вялікія надзеі. Портыка пісаў да Рустыкучы: «Я мяркую, што калі князь маскоўскі прыме добрае рашэнне перайсці ў каталіцкую веру, то наўрад ці кароль адважыцца забараніць мне праезд у Маскву: пра гэта я мяркую па неаднаразовых з ім гутарках, хоць сам ён і не верыць у магчымасць нашага поспеху» [7, с. 230–231].

Місія нунцыя Портыка так і не ажыццявілася, нягледзячы на тое, што Жыгімонт II Аўгуст пайшоў на саступкі і даў згоду на праезд. У гэты час у Рыме стаў вядомы адзін вельмі цікавы твор – «Паданне аб характары і жорсткім кіраванні маскоўскага тырана Васільевіча» Альберта Шліхтынга. Расійскі гісторык І.Д. Гаршкоў, правёўшы супастаўленне некалькіх варыянтаў апавядання Шліхтынга, прыйшоў да высновы, што «Паданне», прачытанае і адпраўленае ў Рым нунцыем Портыка, пераследвала толькі адну мэту - пераканаць папу Пія V адмовіцца ад ідэі саюза з Іванам IV. Аўтарам гэтага паслання мог быць толькі выхадзец з Польшчы ці Вялікага княства Літоўскага [6, с. 45–48].

Дакладна невядома, расказ Шліхтынга ці пасіўнасць Масквы ў падтрыманні перамоваў аказалі вырашальнае дзеянне, але неўзабаве нунцый Портыка паведаміў кардыналу Рустыкучы, што ён адмаўляецца ад паездкі ў Расійскую дзяржаву, баючыся жорсткасці Івана IV [5, с. 221].

Нягледзячы на непаразуменні з некаторымі еўрапейскімі манархамі, папу ўдалося стварыць Лігу хрысціянскіх дзяржаваў для змагання з Асманскай імперыяй і атрымаць перамогу ў бітве пры Лепанта 7 кастрычніка 1571 г. У гонар гэтай перамогі ў літургічны каляндар Каталіцкага Касцёла папа ўвёў свята Маці Божай Ружанцовай. У лістападзе 1571 г. папа напісаў Портыка: «Мы азнаёміліся з тым, што вы паведамілі нам аб Маскоўскім гасудары; не клапаціцеся больш і спыніце зборы. Калі б сам кароль польскі стаў цяпер ухваляць і садзейнічаць вашай паездцы ў Маскву, нават і ў гэтым выпадку мы не жадаем уступаць у зносіны з такімі варварамі і дзікунамі» [7, с. 236].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Натуральна, што змагацца без усялякай выгады для сябе Масква не збіралася, і гэта вельмі добра разумелі ў Рыме. Каб прывабіць выгаднага саюзніка, рабіліся розныя прапановы: абяцалі каралеўскую карону, ганаровы тытул. Тытулатурныя супярэчнасці паміж маскоўскім вялікім князем, які абвясціў сябе царом, і каралём польскім і вялікім князем літоўскім выкарыстоўваліся Рымскай курыяй, каб наладзіць стабільныя адносіны з Іванам IV.

Апостальскі Прастол разглядаў Расійскую дзяржаву як магчымага саюзніка ў барацьбе з Асманскай імперыяй і ў адносінах паміж Жыгімонтам II Аўгустам і Іванам IV імкнуўся прытрымлівацца афіцыйна нейтральнай пазіцыі. Можна адзначыць, што такая пазіцыя Курыі стала таксама вынікам дыпламатычнай гульні, якую вёў Іван IV. Улічваючы зацікаўленасць Рыма ў царкоўнай уніі і арганізацыі антыасманскай лігі, з прычыны распаўсюджвання рэфармацыі і пашырэння ўладанняў Асманскай імперыі, Масква падтрымлівала ў Рыме ілюзіі на свой рахунак. «Тытулатурная» гульня таксама была выгадная Івану IV, бо гэта была яшчэ адна нагода, каб падтрымліваць адносіны з Курыяй. Акрамя таго, у выпадку прызнання Апостальскай Сталіцай поўнага царскага тытула «правы» Расійскага царства на «землі Русі» ўмацоўваліся.

## Спісак літаратуры

1. Acta Nuntiaturae Polonae. – Roma : Institutum Historicum Polonicum, 1990. – T. I / auctore H.D. Wojtyska. – 477 p.
2. Glemma, T. Zapiski nuncjusza polskiego Wincentego dal Portico z roku 1568 / T. Glemma // Collectanea Thealogica. – Lwów, 1936. – T. 17. – S. 273–288.
3. Lamansky, V. Secrets d'ets de Venise / V. Lamansky. – Saint-Petersbourg : imper de e'Acad.imperiale des Science, 1884. – 1026 p.
4. Marco, J. Europa Środkowowschodnia a Zagrożenie Osmańskie od XV do XVII wieku / J. Marco // Europa Środkowowschodnia od X do XVIII wieku – jednoś czy różnorodność / pod. red. K. Baczkowskiego, J. Smołuchy. – Kraków : Societas Vistulana, 2005. – S. 189–193.
5. Акты исторические, относящиеся к истории России: в 2 т. / изд. А.И.Тургенев. – СПб. : Тип. Эдуарда Праца, 1841. – Т. 1 : Выписки из Ватиканского тайного архива и из других римских библиотек и архивов с 1075 по 1584 г. – 401 с.
6. Горшков, И.Д. К вопросу об истории создания «Сказания» Альберта Шлихтинга / И.Д. Горшков // Зубовские чтения : сб.ст. / сост. Н.И. Шириня, С.И. Смирнова. – Струнино, 2004. – С. 45–48.
7. Россия и Италия. Сборник исторических материалов : в 4 т. – СПб. : Импер. Акад. Наук, 1913. – Т. 2., вып. 2. – 688 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова